Трэці, не менш важны метад АА – гэта «належная рэакцыя на памылковы адказ вучня» [4]. Большасць вучняў не імкнецца адказваць на ўроку, каб не памыліцца. Але ж памылковы адказ можна скарэкціраваць і зрабіць правільным. Каб абысці гэтую праблему, настаўнік павінен спакойна выпраўляць памылкі такім чынам, каб у вучняў не ўзнікала думак наконт недасканаласці сябе і сваіх ведаў.

«Сярод аспектаў пытанняў у АА найбольш спрыяльны для навучання – чацвёрты: пошук адказу ў парах» [4]. Важна належным чынам падабраць групы вучняў, каб не вельмі моцны вучань працаваў разам з тым, хто лепш разбіраецца ў дадзенай тэме.

У рэшце рэшт, карыстаючыся метадам АА, трэба памятаць некаторыя правілы:

- «мы крытыкуем не асобу, а толькі яе паводзіны;
- мы кіруемся крытэрыямі ацэньвання, а не сваім бачаннем;
- мы шануем іншую асобу;
- мы намагаемся зразумець іншага чалавека (эмпатыя);
- мы культурным чынам выказваем сваё меркаванне» [4].

Такім чынам, сістэма актыўнай ацэнкі ставіць на мэце дапамагчы вучню выпрацаваць спакойную самакрытычнасць, а таксама набыць здаровую ўпэўненасць у сваіх сілах і ведах.

**Літаратура**


1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко; афармленне А. М. Хількевіча 3-е выд. Мн., 2002.
2. *Стэрна Д.* Асновы метаду актыўнай ацэнкі // Актыўная ацэнка : метад. дапам. / укл. Н. Ільініч. Мн, 2011.
3. *Аксючыц С.* Актыўная ацэнка вучэбных дасягненняў як сродак фарміравання самаацэнкі малодшых школьнікаў // Интернет адрес: http://aacenka.by/?p=7487.
4. *Боргаш Э.* Актыўная ацэнка як філасофія навучання // Интернет адрес: http://nastaunik.info/news/?id=6235.


## ЗВАРОТ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАМЯЦІ Ў ГІСТАРЫЧНЫМ РАМАНЕ «МАЛЬВЫ» РАМАНА ІВАНЫЧУКА

**Н. А. Карповіч**

Еўрапейскі гістарычны раман як літаратурны жанр зарадзіўся ў XIX ст. Яго заснавальнікам лічацца англійскі пісьменнік Вальтэр Скот. Цікава заўважыць, што руская гістарычная проза пачатку XIX ст., раманы і аповесці Я. Аладзьіна, М. Семянтоўскага і інш., звязана з украінскай тэматыкай, героямі іх твораў выступаюць Багдан Хмяльніцкі,

Іван Мазепа. Зрэшты і аповесць Мікалая Гогаля «Тарас Бульба» (сярэдзіна XIX ст.) звязана з гісторыяй Украіны.

Пачатак украінскага гістарычнага рамана ў 60-я гг. XIX ст. быў пакладзены творам Панцеляймона Куліша «Чорная Рада», што таксама вырас на матэрыяле ўкраінскага казацтва. У канцы XIX ст. з'явіўся польскі гістарычны раман, прадстаўлены творамі выдатнага пісьменніка Генрыка Сянкевіча. У прыватнасці, яго раман «Агнём і мячом» пабудаваны на складаных перыпетыях гістарычных узаемаадносін польскага і ўкраінскага народаў. З 20-мі гг. XX ст. даследчыкі звязваюць другі перыяд развіцця гістарычнага рамана ў рускай літаратуры (творы В. Форш, А. Чыпігіна і інш.).

Новы эпат развіцця славянскага гістарычнага рамана пачынаецца ў сярэдзіне XX ст. Так, у Белградзе сербскі пісьменнік Іва Андрыч піша раман «Мост над Дрынай». Вышаградскі мост – сведка трагічнай гісторыі Босніі на працягу 1566 – 1914 гг. Мост – сімвал непарыўнай гісторыі, мінуўшчыны і сучаснасці, яднання людзей і народаў. У 60-я, 70-я гг. XX ст. адбываецца ўздым гістарычнага рамана ва ўкраінскай і беларускай літаратурах, засведчаны творчасцю Паўла Загрэбельнага, Уладзіміра Караткевіча. Вельмі паказальнай з'яўляецца творчае ўзаемадзеянне пісьменнікаў гістарычнай тэмы, якое выявілася, у прыватнасці, у выступленнях У. Караткевіча ва ўсесаюзным друку (часопіс «Дружба народов») з падтрымкай твораў Р. Іванычука. Вялікую культаралагічную прынцыповасць публікацый У. Караткевіча ў абарону творчай пазіцыі Р. Іванычука раскрывае прафесар В. П. Рагойша [5, с. 157–158].

Літаратурны жанр набывае папулярнасць за кошт багатых традыцый ў славянскіх літаратурах, звязаных з развіццём нацыянальна-вызваленчых ідэй, з адстойваннем славянскімі народамі ў барацьбе з чужынцамі права на славянскую мову і культуру, на нацыянальную самабытнасць. Закранаючы мінулае, пісьменнік імкнецца адлюстраваць нашу сучаснасць як ступень на шляху ў будучае, прадстаўляе чалавека як прадукт гісторыі і ў той жа час як яе творцу.

Раман Іванычук лічыць, што галоўная мэта гістарычнага рамана – «…адказ на пытанні: што мой народ у тую ці іншую эпоху здабыў, што згубіў, што мог згубіць? Усё гэта патрэбна сучасніку – і сучаснасці – і для прыкладу, і для перасцярогі» [3, с. 78]. Праца над гістарычным раманам патрабуе ад пісьменніка асаблівай скрупулёзнасці, бо ён намагаецца як мага бліжэй данесці да чытача апісанне падзей і як мага дакладней адлюстрававаць пэўную эпоху.

У рамане «Мальвы», які першапачаткова меў назву «Янычары», Р. Іванычук падымае тэму нацыянальна-вызваленчай барацьбы

украінцаў супраць экспансіі Асманскай імперыі і Крымскага ханства. У адным з інтэрв'ю Іванычук адзначаў перапляценне ў сваіх творах гісторыі і гістарызму: «Першае – гэта дакументалістыка, гістарыяграфія, а другое – гэта, вобразна кажучы, быццам вада ператварылася ў пару. Склад той самы, а якасць і выгляд ужо сусім іншыя. Гістарызм – гэта фактаж, дапоўнены, ператрансфармаваны, перапрацаваны, … пераварaны пры дапамозе домыслу» [3, с. 6]. Аўтар праводзіць дакладную мяжу паміж гістарычным раманам і навуковымі даследваннямі: «Без домыслу гістарычнага рамана няма. Тады гэта будзе гістарыяграфіяй». Пісьменнік адзначае, што ў гістарычны матэрыял, які будзе выкарыстаны ў творы, трэба ўжыцца, каб па-сапраўднаму ўбачыць эпоху з сярэдзіны. «Немагчыма апісаць падзеі, не прывязаўшы сябе да той асновы, дзе разгортваюцца падзеі твору» [3, с. 6].

Сёння раман «Мальвы» карыстаецца вялікай папулярнасцю. Сам пісьменнік вылучае некалькі прычын, якія спрыяюць пашырэнню яго чытацкай аўдыторыі. Па-першае, аповед пра янычарства раскрывае вялікі боль усяго народа. Па-другое, чытачоў прываблівае рамантычнасць твора. Па-трэцяе, арыгінальнасць твора вызначаецца разнастайнасцю фальклорных элементаў.

Твор на гістарычную тэму – гэта ўнікальная сістэма, у якой адбываецца зрашчэнне некалькіх часа-прасторавых з'яў: рэальная прастора (гістарычная падзея), прастора існавання героя («ажыўленне» героямі гістарычных падзей) і прастора чытача. М. Бахцін заўважыў: мастацкі сэнс, каб увайсці ў наш сацыяльны вопыт, павінен набыць пэўны часа-прасторавы змест, г.зн. прыняць знакавую форму. Вялікую ролю, на думку літаратуразнаўцы, у гэтым працэсе адыгрывае хранатоп: «…які-небудзь уступ у сферу сэнсаў здзяйсняецца колькі цераз вароты хранатопаў» [1, с. 121].

Для стварэння варот хранатопу Іванычук па-майстэрску выкарыстоўвае такія фальклорныя «цаглінкі», як песні, легенды, прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы.

Складанасць задачы, якая стаяла перад пісьменнікам, у тым, што патрэбна было тактоўна перадаць нацыянальны каларыт не толькі ўкраінцаў, але і іншых народаў: татараў, туркаў.

Зварот да нацыянальнай творчасці дапамагае пісьменніку не толькі больш дэталёва адлюстраваць гістарычны аспект, але і дазваляе яскрава раскрыць духоўныя каштоўнасці прадстаўнікоў пэўнага народа. Так для ўкраінцаў галоўнай каштоўнасцю з'яўляецца воля. Яны жадаюць хутчэйшага вызвалення ад прыгнятальнікаў сваёй радзіме. У рамане ўкраінскі народ прадстаўлены некалькімі вобразамі, найбольш моцнымі паўстаюць Марыя і Стратон. Пісьменнік у іх вусны ўкладае выказванні

пра нацыянальную свядомасць, пра вызваленне фізічнае і духоўнае: «*ніяка пташка не любить свого господаря, який держить її в золотій клітці»; «не байдужа журавлеві, коли він у теплих краях, холодна в'ялиця на півночі»; «рідна ворона краще співає, ніж чужий соловей»* [4, с. 13, 88, 112].

Праз фальклорны матэрыял, афарызмы, цытаты ўсходніх пісьменнікаў, якія выкарыстаны ў тэксце як эпіграфы, Р. Іванычук падкрэслівае глыбіню ў менталітэце туркаў, татараў. Асаблівая ўвага надаецца мудрасці. Кім бы ты ні быў, у якіх абставінах ты б ні знаходзіўся, заўсёды май пры сабе кемлівую галаву: *«коли мало сили – треба розв'язувати міх із хитрощами»*; *«коли твій ворог навіть мурашка, то вважай її слоном»*; *«та голова, що немає влади над своїм язиком, часто пишається на золотій таці біля воріт Баб-і-гамаюн»* [4, с. 14, 25, 107]. Як асаблівую гістарычную каштоўнасць пісьменнік вылучае разумнага кіраўніка: *«кожний цар, який сп'янів від сваволі, твердіє тоді, коли влада з його рук вислизає»*; *«ти мислиш, а мислячі люди повинні жити»*; *«де багато пастухів, там вовк овець ріже»* [4, с. 20, 58, 71]. Паказальна, што высяленцы крымска-татарскай грамады прызналі Р. Іванычука сваім нацыянальным аўтарам. Бо пісьменнік стварыў прываблівыя вобразы татар, якія, як і ўкраінцы, знаходзіліся ў варожым асяродку [2, с. 35–37].

У шырэйшым разуменні мастацкая тканіна твору «Мальвы» дае падставы разглядаць яго як раман выхавання. У цэнтры твора ўнутранае жыццё маладой гераіні Мальвы, паступовае фарміраванне і самавызначэнне яе як асобы, пошукі магчымасцяў самарэалізацыі ў грамадстве Р. Іванычук падае складаную карціну станаўлення асобы гераіні. З аднаго боку, немагчымасць рэалізаваць саму сябе, захаваць сваю годнасць, вернасць роднаму народу прыводзіць Мальву да гібелі. З другога, толькі адчуўшы еднасць, кроўную і духоўную, з родным народам, Мальва становіцца яскравай індывідуальнасцю, асобай, гераіняй.

У 80-я гг. XX ст. убачыў свет раман кіргіскага пісьменніка Чынгіза Айтматава «Буранны паўстанак» («І больш стагоддзя доўжыцца дзень»), тыпалагічна блізкі гістарычнай прозе Р. Іванычука. Тэма янычарства – адрачэнне ад роднага народа, зямлі і мовы бацькоў, – раскрытая Іванычуком, атрымала асаблівае развіццё ў Ч. Айтматава пры асвятленні такой агіднай сацыяльнай з'явы, як манкуртызм. Абодва пісьменнікі папярэджвалі: чалавек, пазбаўлены гістарычнай памяці, не клапоціцца пра захаванне маралі. А гэта ўрэшце можа прывесці да катастрофы не толькі асобныя народы, але і ўсю планету. У абодвух пісьменнікаў любоў да роднай зямлі як сацыяльная і як маральная каштоўнасць

індывідуўма выдатна раскрываецца дзякуючы глыбокаму веданню роднага фальклора, апоры на розныя жанры народнай мудрасці.

У творы Рамана Іванычука «Мальвы» фальклорныя ўпляценні выконваюць адразу некалькі функцый: 1) ідэйна-змястоўная: нягледзячы на адсутнасць высокага статусу ў грамадстве, героі разумна і лагічна выказваюць свае думкі, карыстаючыся назапашаным уласным і народным вопытам; 2) пазнавальная: адлюстроўвае светапогляд кожнага народа; 3) мастацка-эстэтычная: нельга выкінуць ці зменьшыць колькасць парэмій, твор страціць сваю яскравую непаўторнасць; 4) яднаючая: зварот да розных фальклорных жанраў паказвае неабходнасць далучэння чалавека да адвечных асноў быцця. Усе кампаненты твора «Мальвы» падпарадкавы галоўнай задуме: ідэя гістарычнай нацыянальнай памяці суаносіцца з этыка-эстэтычнай задачай выхавання.

**Літаратура**


1. *Бахтин М. М.* формы времни и хронотопа в романе // Бахтин М.М. Вопросы литературы и эстетики. М., 1975. С. 237–407.
2. *Іваничук Р.* Нещоденний щоденник. // Слово і час. 2004. № 2. С. 27–62.
3. *Іваничук Р.*, *Штонь Г.* Бесіда // Дніпро. 1990. № 6.
4. Інтэрнэт-адрас: www.ukrlit.vn.ua.
5. *Рагойша В.* Лісты У. Караткевіча да Р. Іванычука // Полымя. 1988. № 12. С. 157–165.


# АДЛЮСТРАВАННЕ СПАЛУЧАЛЬНАСНЫХ УЛАСЦІВАСЦЕЙ ПРЫМЕТНІКА Ў СЛОЎНІКАВЫМ АРТЫКУЛЕ


**Ж. Ю. Клімянок**


Адной з асноўных характарыстык лексемы з'яўляецца яе спалучальнасць, г. зн. «здольнасць слова злучацца з пэўным колам іншых слоў у адпаведнасці з нормамі, уласцівымі для дадзенай мовы, а таксама сукупнасць канкрэтных лексічных адзінак, з якімі злучаецца слова пры абазначэнні пэўнай сітуацыі» [9, с. 527]. У залежнасці ад пастаўленых задач, спалучальнасныя ўласцівасці лексем у розныя часы станавіліся прадметам даследавання у працах выбітных лінгвістаў (Н. З. Кацелавай, А. Я. Міхневіча, У. Г. Гака, Н. Д. Аруцюнавай, Б. Ю. Нормана, В. К. Шчэрбіна, Н. У. Юдзінай).

«Як фізічны свет, што нас атачае, складаецца з элементарных часціц матэрыі, так і сінтаксічны лад нашага маўлення арганізуецца разнастайнымі, але рэгулярнымі камбінацыямі элементарных, ці мінімальных, адзінак, далей непадзельных на сінтаксічным узроўні», – вобразна піша Г. А. Золатава [4, с. 51]. Аб'ектам нашага даследавання з'яўляецца якраз адна з такіх «элементарных адзінак» граматычнага ладу беларускай мовы – словаспалучэнне з прыметнікам у якасці аднаго з